Паважаныя калегі!

Ва ўстанове адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы” (Рэспубліка Беларусь, г. Гродна) штогод выдаецца зборнік навуковых артыкулаў "Праблемы грамадзянскага права і працэсу ", які стаў традыцыйным для апублікавання вынікаў навуковых даследаванняў.

Сфера навуковых даследаванняў для апублікавання ўключае ў сябе наступныя актуальныя напрамкі:

- праблемы грамадзянскага і гаспадарчага права, сямейнага права, міжнароднага прыватнага права, жыллёвага права, прадпрымальніцкага права, карпаратыўнага права, камерцыйнага права, права інтэлектуальнай уласнасці;
- праблемы грамадзянскага працэсу, гаспадарчага (арбітражнага) працэсу, трацейскага разбору, міжнароднага грамадзянскага працэсу, прымяненне інфармацыйных тэхналогій у судаводстве (электроннае правасуддзе);
- статус і асаблівасці дзейнасці ўніверсітэта прадпрымальніцкага тыпу;
- стварэнне інстытуцыйнага асяроддзя для развіцця рынкавай эканомікі, фарміравання адзінай эканамічнай прасторы ЕАЭС;
- грамадзянска-прававое забеспячэнне развіцця лічбавай эканомікі;
- пытанні дзяржаўна-прыватнага партнёрства;
- альтэрнатыўныя спосабы вырашэння грамадзянскіх спраў, гаспадарчых спрэчак (медыяцыя і іншыя прымірэнчыя працэдуры);
- натарыят і натарыяльная дзейнасць;
- адвакатура і адвакацкая дзейнасць;
- грамадзянска-прававыя спосабы абароны інтарэсаў удзельнікаў і суб'ектаў турыстычнай дзейнасці;
- грамадзянска-прававыя спосабы абароны гісторыка-культурнай спадчыны і навакольнага прыроднага асяроддзя.

АРЫГІНАЛЬНАСЦЬ - НЕ МЕНШ ЗА 80%.

Рукапісы артыкулаў прадстаўляюцца на папяровым носьбіце аб'ёмам **не менш за 20 000 і не больш за 25 000 друкаваных знакаў** у 2-ух экзэмплярах і ў электронным варыянце ў рэдактары MS Word. Мова публікуемых артыкулаў - руская, беларуская, англійская.

Рукапіс артыкула і звесткі пра аўтара могуць быць прадстаўлены ў рэдакцыю на электронным носьбіце (CD), а таксама па электроннай пошце. Адрас для накіравання рукапісаў: 230013, Рэспубліка Беларусь, г. Гродна, вул.Ажэшкі, 22. Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы, юрыдычны факультэт, кафедра грамадзянскага права і працэсу.

Кантактны тэлефон/ факс: 8-0152-39-86-06

Электронная пошта: kaf_grprav@grsu.by або civil-grodno@list.ru

Рэдакцыйная калегія пакідае за сабой права не рэкамендаваць да апублікавання навуковыя артыкулы, якія не адпавядаюць афарміцельскім патрабаванням, а таксама прадстаўленыя пазней устаноўленага тэрміну.

Тэрмін прадстаўлення навуковых артыкулаў **- да 10 жніўня 2023 года.**